# РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ

7 сьнежня 2018 г.

**Віншаваньне**
**з нагоды 30-годзьдзя ад заснаваньня**
**Таварыства беларускае культуры ў Літве**

Шаноўныя нашыя землякі ў Вільні,

Ад усяго сэрца віншую вас з трыццацігодзьдзем ад заснаваньня Таварыства беларускае культуры ў Літве.

Усе мы ведаем, якое вялікае значэньне мае Вільня для беларускай гісторыі. І гэта азначае вялікую важнасьць таго, каб працягвалася беларуская культурніцкая прысутнасьць на Віленшчыне, каб сярод шматгалосься карэнных насельнікаў краю моцна гучаў і беларускі голас.

Ад імя Рады БНР, якая аб’ядноўвае прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў на некалькіх кантынэнтах, шчыра вітаю вас і жадаю посьпехаў у вашай найважнай для ўсіх нас дзейнасьці.

**Івонка Сурвілла**
**Старшыня Рады БНР**